А. А. РУМАК

# ПРАФСАЮЗНЫ РУХ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1926—1929 ГГ.

Прафсаюзы працоўных адыгрывалі значную ролю ў рабочым руху Польшчы і ў анексіраваных ёю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. На іх дзейнасць негатыўна ўплываў шэраг асаблівасцей, галоўнай з якіх можна лічыць адсутнасць арганізацыйнага адзінства. У пачатку 20-х гг. прафсаюзны рух выразна падзяліўся на дзве часткі: 1. Класавыя прафсаюзы, прадстаўленыя Саюзам прафесійных аб'яднанняў (ЗСЗ). У гэтых прафсаюзах мелі значны ўплыў сацыялістычныя і камуністычныя партыі. 2. Някласавыя прафсаюзы складаліся з левых і правых. Да левых адносіліся нацыянальныя прафсаюзы, якія ўваходзілі ў Польскае прафсаюзнае злучэнне (ЗЗП). Хаця ў сваёй праграме яны таксама прызнавалі класавую барацьбу, аднак на справе ў канфліктах паміж працоўнымі і працадаўцамі займалі пасрэдніцкую пазіцыю. ЗЗП знаходзілася пад уплывам Нацыянальнай рабочай партыі (НПР). Правымі лічыліся хрысціянскія прафсаюзы, праграма дзеяння якіх была заснавана на патрабаваннях да рабочага руху, выкладзеных у энцыкліцы Папы Леона XIII «Rerum novarum». Змест гэтай праграмы складала грамадска-хрысціянская дактрына, якая адмаўляла ўсялякую барацьбу ў грамадстве як не адпавядаючую сацыяльнай роўнасці людзей; дазваляла працоўным аб'ядноўвацца ў прафесійныя арганізацыі, каб абараніць свае правы і падтрымліваць маральныя інтарэсы, выкарыстоўваючы шляхі згоды і супрацоўніцтва з працадаўцамі. Хрысціянскія прафсаюзы сваю дзейнасць узгаднялі з Хрысціянскай Дэмакратыяй (ХД).

Паміж усімі кірункамі прафсаюзаў увесь час вялася ўпартая барацьба за ўплыў на працоўныя масы.

У маі 1926 г. у выніку дзяржаўнага перавароту да ўлады ў Польшчы фактычна прыйшоў Пілсуцкі. З дапамогай адданых вайскоўцаў ён звергнуў канстытуцыйны ўрад Хьено-Пяста. Каб атрымаць давер насельніцтва, Пілсуцкі абяцаў у хуткім часе ўзняць Польшчу да стану вялікай дзяржавы. Гэтая палітыка атрымала назву санацыі, урады, якія яе ажыццяўлялі, санацыйных. Па сутнасці, гэта была спроба стабілізаваць эканамічнае жыццё краіны.

Майскія падзеі значна актывізавалі палітычнае жыццё Польшчы, што прывяло да паглыблення крызісу прафсаюзаў і з'яўленню разам з тым новых рысаў у рабочым руху. Сведчаннем крызісу быў працяг скарачэння радоў прафсаюзаў. Так, нацыянальныя прафсаюзы ў 1926 г. налічвалі 340 тыс. членаў, а праз тры гады толькі 202 тыс. З 120 да 101 тыс. членаў скараціліся хрысціянскія прафсаюзы [1]. У той жа час узрасла колькасць класавых прафсаюзаў з 218 да 241 тыс. чалавек [2]. Гэта было выклікана тым, што бескампрамісная пазіцыя класавых прафсаюзаў супраць націску працадаўцаў больш адпавядала працэсу радыкалізацыі працоўных мас пасля майскіх падзей.

У гады санацыі ў прафсаюзным руху сфармаваўся новы кірунак — праўрадавы. Яго ўзнікненне было вынікам пашырэння адміністрацыйнага і заканадаўчага ўмяшання дзяржавы ў адносіны паміж працай і капіталам, што стала агульнай тэндэнцыяй большасці капіталістычных краін пасля першай сусветнай вайны. У дзяржаве з аднапартыйным урадам, якой стала Польшча пасля захопу ўлады Пілсуцкім, усебакова заахвочваліся толькі тыя прафсаюзы, якія падтрымлівалі палітыку гэтага ўрада.

У Заходняй Беларусі рост аўтарытэту класавых прафсаюзаў яскрава праявіўся ў выніках выбараў праўленняў павятовых кас хворых у Беластоку і Гродна, буйнейшых цэнтрах рабочага руху. Так, на выбарах праўлення касы хворых у Гродна ў 1926 г. ліст № 5, у які былі ўключаны кандыдаты ад рады класавых прафсаюзаў, атрымаў 19 мандатаў з 30 [3]. Пад час першых выбараў у 1925 г. у Беластоку нацыянальныя і хрысціянскія прафсаюзы атрымалі разам 17 мандатаў. Класавыя прафсаюзы тады атрымалі 10 мандатаў. Выбары 1928 г. прынеслі вынікі, якія адлюстравалі новы расклад сіл. За класавыя прафсаюзы, якія знаходзіліся пад уплывам ППС, аддалі свае галасы 2672 выбаршчыкі, што дазволіла атрымаць ім палову ўсіх мандатаў — 15. Акрамя таго, 5 мандатаў атрымалі класавыя прафсаюзы, якія падтрымлівалі Бунд і Паалей-Цыён. У той жа час някласавыя праф-

саюзы, аб'яднаныя ў Польскі дэмакратычны блок, атрымалі толькі 9 мандатаў.

Аб павышэнні ролі класавых прафсаюзаў Беластока сведчыла і колькасць уваходзячых у іх склад рабочых. У другой палове 1926 г. у акруговай камісіі класавых прафсаюзаў Беластока было 19 аддзелаў прафсаюзаў, якія аб'ядноўвалі 5500 членаў. Гэта складала 41,7 % усіх арганізаваных працоўных [4].

На тэрыторыі Палескага ваяводства цэнтрамі класавых прафсаюзаў сталі Брэст і Пінск. Так, у пачатку 1927 г. у Брэсце пад кіраўніцтвам мясцовай рады дзейнічаў 21 класавы прафсаюз, які аб'ядноўваў больш за 1500 чалавек, а рада класавых прафсаюзаў Пінска мела 22 прафсаюзы (1950 членаў)[5].

Найбольш значны рост класавых прафсаюзаў назіраўся ў Вільна, дзе ў 1926 г. іх рады налічвалі 1600 чалавек. Амаль праз тры гады, у канцы 1928 г., да прафсаюзаў, аб'яднаных акруговай камісіяй, ужо належыла 3585 чалавек. Да гэтай камісіі адносіліся і прафсаюзы мясцовай рады яўрэйскіх класавых прафсаюзаў, якая аб'ядноўвала 1767 членаў. Разам яны складалі палову ўсіх арганізаваных працоўных Вільна [6]. Прычына такога паскоранага росту класавых прафсаюзаў крыецца ў іх актыўнай дзейнасці па абароне сацыяльна-эканамічных інтарэсаў працоўных Віленшчыны.

Адным з фактараў, які садзейнічаў працэсу ўзмацнення класавых прафсаюзаў у перыяд 1926—1929 гг., была іх большая, у параўнанні з другімі кірункамі прафсаюзаў, распаўсюджанасць і арганізаванасць.

Узмацненне ролі класавых прафсаюзаў, як правіла, адбывалася за кошт аслаблення някласавых прафсаюзаў. Найбольш значны спад у гэты перыяд перажывалі нацыянальныя прафсаюзы (ЗЗП). Яшчэ ў 1924 г. акруговыя рады гэтых прафсаюзаў у Беластоку і Гродна былі найбольш уплывовымі ў прафсаюзным руху і пры гэтым найбольш колькаснымі. Так, саюз працаўнікоў тэкстыльнай прамысловасці «Праца» налічваў 3 тыс. чалавек, а класавы прафсаюз толькі каля 500. Аднак 1926 г. стаў пачаткам канчатковага аслаблення аўтарытэту нацыянальных прафсаюзаў: ахопленыя імі працоўныя складалі ўсяго 11,4 % аб'яднаных у прафсаюзы працоўных Беластока. У Гродна акруговая рада ЗЗП за 1926 г. страціла некалькі аддзелаў, у асноўным на карысць класавых. У снежні 1926 г. да рады класавых прафсаюзаў перайшоў найбольшы з гродзенскіх нацыянальных прафсаюзаў — аддзел прафсаюза дрэваапрацоўшчыкаў (у колькасці 350 чалавек), а ў лютым 1927 г. — аддзел польскага прафсаюза чыгуначнікаў [7]. У 1929 г. спыніла сваё існаванне Беластоцкая акружная рада ЗЗП, астатнія прафсаюзы перайшлі да класавых і хрысціянскіх.

На аслабленне пазіцый нацыянальных прафсаюзаў паўплывалі не толькі знешнія фактары, але і некаторыя ўнутраныя прычыны. Па-першае, гэтаму садзейнічаў раскол у Нацыянальнай рабочай партыі ў 1926 г., у выніку якога ўтварылася НПР-лявіца. Новая партыя заявіла аб падтрымцы ўрада і імкнулася распаўсюдзіць свой уплыў на нацыянальныя прафсаюзы, а гэта, безумоўна, падрывала адзінства і зніжала актыўнасць апошніх. Па-другое, не садзейнічала іх аўтарытэту непаслядоўная тактыка. Па-трэцяе, адштурхоўвала працоўных і падтрымка з боку кіраўніцтва нацыянальных прафсаюзаў ідэалогіі антысемітызму.

У 1927—1929 гг. толькі чыгуначнікі былі той часткай працоўных, на якую нацыянальныя прафсаюзы ў значнай ступені захавалі свой уплыў. Аб'яднанне прафсаюза чыгуначнікаў (ЗЗП) і польскага прафсаюза чыгуначнікаў у адзінае Аб'яднанне чыгуначнікаў польскіх (ЗКП) у пачатку 1929 г. узмацніла гэты ўплыў. Так, Віленская акруга ЗКП, дзейнасць якой распаўсюджвалася на тэрыторыю ўсіх паўночна-ўсходніх ваяводстваў, у 1929 г. налічвала 3500 чалавек [8].

Хрысціянскія прафсаюзы ў Заходняй Беларусі мелі найбольшае распаўсюджанне на Віленшчыне і Беласточчыне, што тлумачылася значным уплывам на гэтай тэрыторыі клерыкальных арганізацый. У Палескім і Навагрудскім ваяводствах да хрысціянскіх прафсаюзаў належылі толькі некаторыя прафсаюзы чыгуначнікаў.

У рабочым руху Беласточчыны ў 1926 г. хрысціянскі прафсаюзны кірунак займаў другое месца пасля класавага. У самім Беластоку акружны сакратарыят ХЗЗ аб'ядноўваў 31,7 % усіх арганізаваных працоўных. Такога стану сакратарыяту ўдалося дасягнуць дзякуючы падтрымцы з боку

часткі дзяржаўнай адміністрацыі і каталіцкага кліру, якіх задавальняла дзейнасць хрысціянскіх прафсаюзаў. Акрамя таго, хрысціянскія прафсаюзы ўдала выкарысталі спад актыўнасці нацыянальных прафсаюзаў і перацягнулі частку іх членаў пад кіраўніцтва сваіх сакратарыятаў у Беластоку і Гродна [9].

Крызіс прафсаюзаў у большай ступені закрануў Віленшчыну. У адрозненне ад Беластока, у Вільні хрысціянскія прафсаюзы былі найбольш уплывовымі. Імі кіравала мясцовае незалежнае аб'яднанне — Цэнтральны саюз хрысціянскіх прафсаюзаў, якое ўзнікла яшчэ ў ліпені 1921 г. У 1926 г. з 70 прафсаюзаў Вільна 33 уваходзілі ў Цэнтральны саюз і налічвалі больш за 6000 членаў. Аднак за наступныя тры гады іх колькасць скарацілася да 3273 [10]. Такое становішча было выклікана не толькі агульным скарачэннем колькасці працоўных у прафсаюзах Польшчы і Заходняй Беларусі і адыходам часткі членаў хрысціянскіх саюзаў да класавых, але і ўзнікненнем у рабочым руху новага кірунку прафсаюзаў — праўрадавага.

У Заходняй Беларусі станаўленне праўрадавых прафсаюзаў неадрыўна звязана з дзейнасцю Польскай сацыялістычнай партыі, былой рэвалюцыйнай фракцыі (ППС д ФР). Як самастойная палітычная сіла гэта партыя з'явілася ў кастрычніку 1928 г. у выніку расколу ППС па прычыне розніцы поглядаў яе кіраўнікоў на адносіны партыі да ўрада і рэжыму санацыі. Кіраўнікі новай партыі, засведчыўшы сваю падтрымку ўраду і асабіста Пілсуцкаму, пачалі змаганне за ўплыў на працоўныя масы, асабліва ў класавых прафсаюзах.

Найбольшую актыўнасць сацыялісты-фракцыянеры, нягледзячы на малы колькасны склад сваіх арганізацый, праявілі ў Беластоку. Звязана гэта было з тым, што да новай партыі перайшлі дзеячы, вядомыя сваім уплывам у ППС і класавых прафсаюзаў. У выніку расколу класавых прафсаюзаў Беластока ўзнікла 6 новых саюзаў, якія аб'яднала ўтвораная ў другой палове 1929 г. акруговая рада. Такому хуткаму поспеху ў многім садзейнічала праведзеная ППС д ФР акцыя ў абарону рабочых ад выдачы заработнай платы талонамі.

У Гродна мясцовая рада праўрадавых прафсаюзаў аб'яднала прафсаюзы работнікаў хімічнай прамысловасці, хатняй службы, шафёраў, дворнікаў, будаўнікоў, лекараў. У адрозненне ад Беластока, тут у новыя саюзы ўвайшлі выхадцы з нацыянальных (будаўнікі) і хрысціянскіх (дворнікі і работнікі хатняй службы) прафсаюзах, а з класавых прафсаюзаў, якія знаходзіліся пад уплывам ППС і Бунда, — нязначная частка [11].

Узрос уплыў ППС-фракцыі і ў прафсаюзах Палескага ваяводства. Так, у канцы 1929 г. пад яе кіраўніцтвам было ў Брэсце 10, а ў Пінску 4 прафсаюзы, якія аб'ядноўвалі больш за 2000 чалавек [12].

У Вільні праўрадавыя прафсаюзы пачалі дзейнічаць пад назвай «гаспадарчыя». Узначальвалі іх вядомыя ў прафсаюзным руху дзеячы, якія раней належылі да ППС, Бунда і нават тыя, хто прытрымліваўся камуністычных поглядаў. У апошні год перад крызісам «гаспадарчыя» прафсаюзы ўжо аб'ядноўвалі каля 3000 членаў [13].

Такі значны рост праўрадавых прафсаюзаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі тлумачыўся актыўнай агітацыйнай працай, якую праводзілі іх арганізатары. Карыстаючыся падтрымкай мясцовых улад і многіх уладальнікаў прадпрыемстваў, яны абяцалі забяспечыць працай тых, хто яе ўжо згубіў, а працоўным давалі гарантыю ад беспрацоўя. Адчуваючы ціск надыходзячага крызісу, працоўныя былі вымушаны верыць гэтай агітацыі. У той жа час у працоўных масах назіралася некаторае расчараванне лозунгамі і радыкальнымі заявамі сацыялістычных партый і камуністаў.

Барацьба розных прафсаюзных аб'яднанняў за ўплыў на працоўных не засланяла ад іх уласных унутраных працэсаў. Маецца на ўвазе змаганне за ўплыў на дзейнасць прафсаюзаў унутры саміх гэтых аб'яднанняў з боку розных палітычных партый і аб'яднанняў. Калі някласавыя хрысціянскія і праўрадавыя прафсаюзы знаходзіліся пад эгідай адной Хрысціянскай Дэмакратыі і Беспартыйнага блоку супрацоўніцтва з урадам, то для класавых прафсаюзаў іх падлегласць была вельмі вострай праблемай, якая мела прамую сувязь з праблемай адзінства. Заключалася яна ў знаходжанні пад уздзеяннем дзвюх процістаячых сіл: з аднаго боку — Польская сацыялістычная партыя і Агульнаяўрэйскі рабочы саюз (Бунд), а з другога — Кампартыя Заходняй Беларусі. Кожная з гэтых сіл неаднойчы рабіла заявы аб падтрымцы адзінства класавых прафсаюзаў. Аднак у сапраўднасці

адзінства было немагчыма, таму што кожны з бакоў абвінавачваў другі ў расколе прафсаюзаў, а погляды на адзінства прафсаюзаў з боку сацыялістаў і асабліва камуністаў выключалі магчымасць адзінства. Сацыялісты прапанавалі камуністам распусціць свае арганізацыйныя структуры ў прафсаюзах («чырвоныя» фракцыі, левыя секцыі і фабрычна-заводскія камітэты) і змагацца за ўплыў дэмакратычным шляхам выбараў у іх кіруючыя органы. У камуністаў былі другія погляды. Аб гэтым пераканаўча сведчыць рэзалюцыя цэнтральнага прафаддзела КПЗБ з прапановамі Віленскаму акружному камітэту партыі ад 7 лютага 1929 г., у якой гаварылася, што «адзінства класавага прафруху ў нашым разуменьні гэта было і ёсць адзінства найшырэйшых працоўных мас пад кіраўніцтвам кампартыі...» [14].

Тое, што ніводны з супрацьлеглых бакоў не жадаў лічыцца з пазіцыяй другога, безумоўна, не спрыяла адзінству класавых прафсаюзаў у барацьбе за сацыяльна-эканамічныя інтарэсы і дэмакратычныя правы працоўных. Выхад з гэтай сітуацыі бачыўся ва ўзаемным кампрамісе, а далей — у адзіным рабочым фронце, які б гарантаваў узаемадзеянне розных палітычных сіл у інтарэсах абароны правоў працоўнага чалавека.

[1] Гл.: H a s s L. // Kwartalnik historii ruchu zawodowego. 1981. № 3.
[2] Гл.: K o w a l s k i J. Zarys historii polskiego ruchu robotniczego w Latach 1918—1939. Warszawa, 1962. S. 364.
[3] Гл.: Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 17, воп. 1, спр. 142, арк. 186.
[4] Гл.: Ruch robotniczy na Bialostocczyznie: Studia i materialy. Warszawa, 1987. S. 85, 101, 108.
[5] Гл.: Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). Ф. 2, воп. 1, спр. 731, арк. 146—148.
[6] Гл.: Rocznik statystyczny m. Vilna 1921—1928. Wilno, 1930. S. 176.
[7] Гл.: Ruch robotniczy... S. 86—87.
[8] Гл.: Дзяржаўны архіў Рэспублікі Літва (ДАРЛ). Ф. 53. воп. 23, спр. 1638, арк. 3.
[9] Гл.: Ruch robotniczy... S. 87.
[10] Гл.: ДАРЛ. Ф. 53, воп. 23, спр. 1638, арк. 56.
[11] Гл.: Ruch robotniczy... S. 138.
[12] Гл.: ДАБВ. Ф. 1, воп. 9, спр. 1376, арк. 13—15.
[13] Гл.: Архіў КПБ. Ф. 242, воп. 1, спр. 225, арк. 116.
[14] Там жа. Спр. 150, арк. 208.

Э. М. ЗАГОРУЛЬСКИЙ

## О ЛЕТОПИСНЫХ «ПЛЕМЕНАХ» ВОСТОЧНЫХ СЛАВЯН

Широко распространено представление о раннем заселении восточными славянами территории Восточной Европы. Развитие восточнославянского этноса, как представлялось исследователям, шло по такой схеме. Сначала существовали первичные племена восточных славян. Затем они объединились в группы или союзы племен, имевшие свою культурную и этнографическую специфику. В процессе становления Древнерусского государства шло постепенное подчинение Киеву этих группировок. В условиях государственности они со временем утратили свою специфику и слились в единую общность — древнерусскую народность. Эта схема стала традиционной и вошла в современные школьные и вузовские учебники.

Однако такое представление пришло в противоречие с важнейшими фактами, относящимися к данной проблеме. Так, археологические материалы свидетельствуют, что на большей части будущей Руси славяне появились поздно: в IX и даже X в. Самые ранние слои в Новгороде, заселение славянами района Оки и, по мнению ряда исследователей, даже области северней Припяти датируются также X в. [1]. Следовательно, основное массовое расселение их происходило тогда, когда уже возникло Древнерусское государство. Поэтому нет хронологической ниши, куда бы можно было поместить значительную часть так называемых племенных союзов. Далее, неславянскими оказались такие памятники, как длинные курганы и новгородские сопки, предшествующие эпохе Древней Руси, которые раньше отождествлялись соответственно с кривичами и ильменскими словенами. Следовательно, по археологическим данным уже невозможно проследить становление здесь названных восточнославянских группировок. Отмечу еще одно важное обстоятельство. Казавшаяся столь логичной практика